# СЕКЦИЯ V
# МЕСТО И РОЛЬ БЕЛАРУСИ В МИРОВОМ ИСТОРИЧЕСКОМ ПРОЦЕССЕ

## ГІСТАРЫЧНЫ ЛЁС СКАРБАЎ НЯСВІЖСКАГА ЗАМКА

**Н. С. Гвоздзева**

*Гомельскі дзяржаўны тэхнічны універсітэт*
*імя П. В. Сухога, Беларусь*

Навуковы кіраўнік канд. гіст. навук, дац. С. А. Елізараў

Нясвіжскія мастацкія зборы князеў Радзівілаў фармаваліся на працягу стагоддзяў. Увогуле ля іх вытокаў стаяў Мікалай Радзівіл (1515–1565) па мянушцы Чорны. Для свайго палаца у Бярэсці Чорны набыў два галандскія габелены – «Хрышчэнне Хрыста у Іардане» і «Лютэр сярод электараў». Сын Чорнага Мікалай Крыштоф Сіротка (1549–1616) паклаў пачатак стварэнню нясвіжскай калекцыі твораў мастацтва. У замку былі адведзены спецыяльныя памяшканні пад галерэі – збройную, партрэтную, мармуровую, залатую, гетманскую, бібліятэчную. Партрэтная галерэя размяшчалася на пачатку XVII ст. у трох залах, дзе вісела адпаведна 28, 94 і 150 партрэтаў. У бібліятэчнай зале стаялі мармуровыя бюсты гістарычных асобаў, чучалы экзатычных жывелаў і рыбаў, барометры, прылады для перспектыўнага малявання і г. д. Скарбніца размяшчалася ў адным з дапаможных карпусоў.

У вайну 1654–1667 гг. Нясвіж быў разбураны рускімі войскамі, а замак абрабаваны. Невядома куды трапілі 11 партрэтаў, заказаных Крыштофам Радзівілам у 1620 г. віленскаму партрэтысту Яну Мачульскаму. Падчас вайны са Швецыяй у 1706 г. шведскае войска таксама разрабавала маемасць Нясвіжскага замка. У 1763, 1768, 1770–1775 гг. рускія вайскоўцы, што часова раскватароўваліся ў замку, таксама рабавалі яго. Напрыклад, у 1772 г. была разрабавана Радзівілаўская скарбніца. Самую каштоўную частку рэчаў, твораў старажытнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва – зброю, вырабы з золата, срэбра і каштоўных камянеў – адправілі ў Пецярбург, частку – у Смаленск. Нясвіжская бібліятэка Радзівілаў, што да 1772 г. налічвала 20 тыс. тамоў, была вывезена А. Бібікавым у Пецярбург. На той час там знаходзіўся і хатні кніжны збор, які сабрала Ганна Радзівіл (1676–1746, родам з Сангушкаў) у Радзівілаўскім замку мястэчка Белая (Бяла, цяпер у межах Польшчы). Варта згадаць, што ў бібліятэцы таксама захоўваўся кніжны збор Якуба Генрыха Флемінга (1667–1728), каралеўскага міністра Аўгуста III, набыты Радзівіламі напачатку XVIII ст. Акрамя таго, у Ардынацкай бібліятэцы быў таксама аддзел рукапісаў, дзе захоўваліся 17 тамоў літоўскіх прывілеяў (Acta Tomiciana), якія былі перададзены ў 1951 г. Мікалаю Радзівілу каралем польскім і вялікім князем літоўскім Жыгімонтам II Аўгустам.

Кнігазбор і рукапісы Нясвіжскай бібліятэкі, передадзеныя імператарскай Акадэміі навук у 1772 г., у 1842 г. перaразмеркавалі. Частку з іх перадалі Санкт-Пецярбургскай духоўнай акадэміі, частку – універсітэцкай бібліятэцы ў Маскве, частку – бібліятэцы Генеральнага штаба ў Пецярбургу. Універсітэцкая бібліятэка ў

Маскве атрымала ўсе беларускія, польскія і лацінскія хронікі, што захоўваліся ў Нясвіжы. Але найбольшую колькасць рукапісаў і рукапісных кніг атрымала імператарская Публічная бібліятэка. Вядома, што 11 інкунабулаў з Нясвіжскай бібліятэкі Радзівілаў сення знаходзяцца ў Дзяржаўнай бібліятэцы Расійскай Федэрацыі (г. Масква), некалькі экзэмпляраў – у бібліятэках Вільнюса.

Пасля канфіскацыі маемасці ў 1772 г. Радзівілы зноў запоўнілі сваю скарбніцу каштоўнасцямі. Паводле вопіса 1779 г. у Нясвіжскім замку налічвалася ужо 984 творы «на дрэве і палатне». Значныя страты панес Нясвіжскі замак з чэрвеня 1792 г., калі горад занялі рускія вайскоўцы. Новыя рабаванні замка рускімі войскамі на чале з генераламі Кнорынгам і Тучковым адбыліся ў канцы кастрычніка 1812 г. Даведаўшыся пра рабаванні Нясвіжскага замка генераламі ў асабістых мэтах, адмірал Чычагаў стварыў спецыяльную камісію з вышэйшых афіцэраў, якія павінны былі сачыць за ходам рэквізіцыі радзівілаўскіх каштоўнасцяў. Яны афіцыйна забралі са скарбніцы тое, што засталося пасля Кнорынга і Тучкова – «калекцыю розных каштоўных каменняў, сабраную ў даўнія часы, брыльянты ў аправе і без аправы; шмат тытуневых залатых і сярэбраных, упрыгожаных брыльянтамі; камплекты розных антыкаў». Са згоды камісіі вывезлі шмат сталовага серабра (на сто асобаў); замежны фарфор і фаянс; прафесійна скамплектаваныя нумізматычныя калекцыі; замежныя творы жывапісу; кітайскія і турэцкія папоны (накідкі на коней); зброю, рыцарскія даспехі, старыя сярэбраныя вырабы, кубкі, «living rознымі штукамі і каштоўнымі медальенамі аблепленыя», маршалкаўскія кіі, аздобленыя золатам і брыльянтамі; манстранцыі сярэбраныя і залатыя, таксама ўпрыгожаныя брыльянтамі. Па загадзе камісіі ўсе скарбы запакавалі ў скрыні і вывезлі на 13 брычках. Пазней Чычагаў перадаў частку каштоўнасцяў Успенскаму сабору ў Маскве, частку – Эрмітажу ў Санкт-Пецярбургу. Рэшткі кітайскіх і турэцкіх тканінаў для аздобы сценаў, дываноў, карабелаў, шабляў, рыцарскіх даспехаў, паляўнічых стрэльбаў і тэатральных касцюмаў, люстэркаў рознай велічыні, а таксама вырабаў з медзі, якія Чычагаў не змог вывезці, аддалі на разрабаванне арміі і мясцовым гандлярам. Тады ж забралі частку архіва, а частку проста раскідалі па розных мясцінах. Ацалелыя каштоўнасці і зборы замка, якія былі лепей прыхаваны, забраў генерал Тучкоў. Ен вярнуўся ў Нясвіж 3 снежня 1813 г. і вывез крэслы, «обіцце», люстэркі, рэшткі бібліятэкі, нават фіранкі з вокнаў і пасцель, рэшткі конскай збруі, медныя вырабы, карэты і «астатнюю рухомасць, якая была». Паводле падлікаў тагачаснага маршалка Нясвіжскага замка А. Бургельскага, штаб адмірала Чычагава і яго падначаленыя толькі з замка вывезлі каштоўнасцяў не менш, чым на 10 мільенаў польскіх злотых. Аднак Бургельскаму ўсе ж удалося схаваць ад рабаўнікоў 60 пудоў сталовага серабра, а таксама шмат іншых рэчаў. Засталіся ў «гетманскай» зале партрэты Радзівілаў і іх сваякоў.

Значныя рабункі Нясвіжскага замка адбыліся ў часы замежнай інтэрвенцыі і грамадзянскай вайны. Пасля заканчэння савецка-польскай вайны згодна з артыкулам XI Рыжскага мірнага дагавора і дадатка № 3 да яго (сакавік 1921 г.) РСФСР і Польшча падзялілі між сабой не толькі беларускія землі, але і культурныя каштоўнасці, перадача якіх адбывалася на працягу некалькіх гадоў. Так, у 1928 г. па патрабаванні польскага ўрада СССР аддаў невялікую частку каштоўнасцяў замка, вывезенных у Расію ў 1792 і 1812 гг. Шмат нясвіжскіх каштоўнасцяў было знішчана або без следу загублена. 5 ліпеня 1941 г. бюро ЦК КП(б)Б вырашыла перадаць замак аўтадарожнаму тэхнікуму, бібліятэку і архіў – Акадэміі навук БССР, карціны і жывапісныя партрэты, а таксама некалькі скульптурных партрэтаў, збор слуцкіх паясоў, частку мэблі, скульптурныя кампазіцыі і каштоўныя вазы – Дзяржаўнай

карціннай галерэі БССР, створанай у 1939 г., гарматы, частку рыцарскіх даспехаў XVI ст., збор агнястрэльнай і халоднай зброі – Беларускаму дзяржаўнаму музею (збор зброі, вывезены нямецкімі захопнікамі, быў часткова вернуты з Усходняй Прусіі і размеркаваны паміж Беларускім дзяржаўным і Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеямі, частку рыцарскіх даспехаў – кінастудыі «Савецкая Беларусь», збор з паляўнічай залы – музею Беластоцкага дзяржаўнага запаведніка, касцюмы – Дзяржаўнаму Вялікаму тэатру оперы і балета. Астатнюю маемасць рэалізавалі праз дзяржаўны гандаль.

У часы Вялікай Айчыннай вайны ў Германію былі вывезены радзівілаўскі архіў (ен вернуты і захоўваецца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь); каштоўнасці Дзяржаўнай карціннай галерэі БССР (вернуты часткова); фонды Беларускага дзяржаўнага музея (вернуты часткова). Скарбы, вывезеныя у Расію, не вернуты зусім. Месца знаходжання многіх з іх вядома, але большасць нясвіжскіх каштоўнасцяў трэба яшчэ шукаць у сховішчах Масквы, Санк-Пецярбурга, а таксама ў Германіі.